# РЭЗЮМЭ

Трасцянка Інга Валер’еўна

## Мастацкая інтэрпрэтацыя гістарычнага мінулага ў творчасці Людмілы Рублеўскай

**Ключавыя словы:** гістарычнае мінулае, мастацкая інтэрпрэтацыя, міфалагізацыя, сучасная гістарычная літаратура, канкрэтна-гістарычныя вобразы.

**Аб’ект даследавання** – паэтычныя зборнікі Л. Рублеўскай “Шыпшына для Пані”, “Замак месячнага сяйва” і празаічныя творы (раман “Золата забытых магіл”, аповесці “Пярсцёнак апошняга імператара”, “Сэрца мармуровага анёла”, “Старасвецкія міфы горада Б*”).

**Прадмет даследавання** – мастацкая інтэрпрэтацыя гістарычнага мінулага ў паэтычным і празаічным набытку Л. Рублеўскай.

**Мэта** работы – раскрыць адметнасці мастацкай інтэрпрэтацыі гістарычнага мінулага ў творчасці Л. Рублеўскай.

**Метадалагічнай базаю** навуковай работы сталі напрацоўкі тэарэтыкаў літаратуры, літаратуразнаўцаў і крытыкаў. Для вырашэння пастаўленых задач выкарыстаны асноўныя прынцыпы параўнальна-гістарычнага і апісальнага метадаў, прыёмы кампаратыўнага аналізу.

**Навуковая навізна.** Дыпломная работа з’яўляецца спецыяльным літаратуразнаўчым даследаваннем, прысвечаным вывучэнню асноўнай у творчасці Л. Рублеўскай гістарычнай тэмы. Вызначаюцца асаблівасці мастацкай трансфармацыі гісторыі і міфа ў творчасці Л. Рублеўскай, даследуецца спецыфіка выяўлення гістарызму як спосабу мыслення пісьменніцы ў паэтычных і празаічных творах, выяўляюцца асаблівасці мастацкага асэнсавання гістарычнага мінулага ў паэзіі Л. Рублеўскай, аналізуюцца гістарычныя сюжэты і вобразы, раскрываецца спецыфіка іх інтэрпрэтацыі ў празаічных творах Л. Рублеўскай.

**Практычная значнасць атрыманых вынікаў.** Матэрыялы даследавання маюць навукова-тэарэтычную каштоўнасць і могуць выкарыстоўвацца пры далейшым аналізе творчасці Л. Рублеўскай, а таксама пры напісанні курсавых і дыпломных работ.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ